УДК 001.891.3



**Г. Ф. Швед**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт


## ДЫПЛОМНАЯ РАБОТА ЯК АДЗІН З ВІДАЎ НАВУКОВАЙ ПРАЦЫ


У артыкуле адлюстроўваюцца асаблівасці беларускага навуковага маўлення пры рабоце над дыпломным праектам, даюцца асновы падрыхтоўкі і афармлення навуковай працы ў адпаведнасці з нарматыўнымі дакументамі, вызначаюцца асноўныя заканамернасці функцыянальнага стылю навуковай і тэхнічнай літаратуры.

Варта мець на ўвазе, што дыпломная работа – гэта не пераказ крыніц літаратуры, а дастаткова самастойная даследчая праца. Яна ўключае ў сябе: вылучэнне праблемы, якая не атрымала дастатковага асвятлення ў літаратуры; выяўленне і ўвядзенне ў навуковую мову новых крыніц і паведамленне на гэтай аснове новых фактаў; устанаўленне новых сувязей паміж вядомымі з'явамі; новую пастаноўку вядомай праблемы; арыгінальныя вывады; рэкамендацыі аб выкарыстанні выяўленных матэрыялаў і вывадаў у навуцы або практыцы.

Выкананне дыпломнай работы ў значнай меры дае магчымасць меркаваць аб падрыхтаванасці выпускніка да далейшай дзейнасці. Асноўнымі мэтамі дыпломнай работы з'яўляюцца: сістэматызацыя, пашырэнне і паглыбленне тэарэтычных ведаў будачага спецыяліста; развіццё навыкаў самастойнай працы, авалоданне методыкай даследавання і эксперыментаванне пры рашэнні практычных задач.

Артыкул будзе карысны студэнтам усіх спецыяльнасцей тэхнічных ВНУ пры падрыхтоўцы, афармленні і абароне дыпломнай работы.



**Ключавыя словы:** дыпломны праект, тэма, даследаванне, навуковы кіраўнік, абарона.



**H. F. Shved**
Belarusian State Technological University


## THESIS PROJECT AS ONE OF TYPES OF RESEARCH WORK


The article reflects the features of the Belarusian scientific style of speech when working on a graduation project, gives basic principles of preparation and execution of scientific work in accordance with regulatory documents, defines the basic laws of the functional style of scientific and technical literature.

The author emphasizes that the diploma work is not just retelling of literally sources but independent research work. It includes: highlighting the problem that did not get sufficient coverage in the literature; discovery and introduction to scientific speech of new sources and reporting on this basis of new facts; establishing of new connections between familiar phenomena; new formulation of the application of the identified materials and conclusions in science or practice.

The implementation of the thesis largely gives the opportunity to judge the graduate's readiness for the further activities.

The main objectives of thesis are: systematization, expansion and deepening of theoretical knowledge of future specialist; the development of skills for independent work, mastering the methodology of research and experimentation in solving practical problems.

The article will be useful to students of all specialties of technical universities in the preparation, design and defense of thesis.



**Key words:** thesis project, project, topic, research, supervisor, defense.


**Уводзіны.** Працэс падрыхтоўкі і выканання дыпломнай работы ўключае некалькі асноўных этапаў: выбар тэмы; пацвярджэнне яе кафедрай; складанне плана працы; выбар методыкі працы над крыніцамі і літаратурай; складанне каляндарнага плана выканання

працы; збор матэрыялу, складанне бібліяграфіі, аналіз і абагульненне сабранага матэрыялу; пісьмовае выкладанне вынікаў даследавання; фармулёўка вывадаў; праверка тэксту навуковым кіраўніком, складанне ім водгуку аб дыпломнай працы; унясенне выпраўленняў і літаратурная апрацоўка рукапісу; афармленне дыпломнай работы, унясенне змяненняў на камп'ютары і складанне бібліяграфіі, афармленне вокладкі; рэцэнзаванне дыпломнай працы; падрыхтоўка да абароны; напісанне тэксту выступлення, падбор неабходных матэрыялаў (схем, дыяграм, табліц, ілюстрацый) для дэманстрацыі падчас абароны.

**Асноўная частка.** Важным і адказным этапам у напісанні дыпломнай работы з'яўляецца выбар тэмы.

Пры вызначэнні тэмы ўлічваюць не толькі яе актульнасць у навуковым і практычным плане, але і наяўнасць крыніц і літаратуры. Акрамя таго, яна павінна даць студэнту магчымасць выявіць сябе як даследчыка.

Важнае значэнне пры выбары тэмы дыпломнай работы мае асвятленне яе ў літаратуры. Па некаторых тэмах ёсць значная колькасць публікацый, што сведчыць аб іх распрацаванасці. З аднаго боку, гэта аблегчыць студэнту работу над дыпломным праектам, а з другога боку, наяўнасць разнастайнай літаратуры па тэме ўскладніць вылучэнне якіх-небудзь аспектаў па гэтай праблеме і ўнясенне свайго ўкладу ў яе асвятленне. Усё гэта неабходна ўлічваць.

Тэматыка курсавых і дыпломных работ распрацоўваецца кафедрамі. Яе змест прадвызначаецца пералікам курсаў і спецкурсаў, якія чытаюцца на дадзенай кафедры. Канчаткова тэматыку зацвярджае савет факультэта. Фармулёўка тэмы дыпломнай работы вызначаецца студэнтам сумесна з навуковым кіраўніком і можа некалькі адрозніваецца ад той, якая мелася ў спісе тэм. Тэму кожнаму дыпломніку зацвярджае спачатку кафедра, потым савет факультэта, а затым рэктар.

Перш чым прыступаць да складання плана, неабходна правесці кансультацыю з навуковым кіраўніком па складанні плана і вызначэнні зместу будучай работы і яе структуры. Пры распрацоўцы плана трэба выдзеліць два галоўныя жанры: складанне папярэдняга і канчатковага вырянтаў плана. Папярэдні план складаецца звычайна пасля зацвярджэння тэмы і агульнага знаёмства з асноўнымі крыніцамі і літаратурай. Канчатковы варыянт плана ўзгадняецца з навуковым кіраўніком і пасля гэтага становіцца абавязковым дакументам. Змяненне плана дапускаецца толькі са згоды навуковага кіраўніка. Калі ж узнікае рознагалоссе ў студэнта і яго кіраўніка, то канчатковае рашэнне прымае кафедра. План дыпломнага даследавання павінен уключаць назву тэмы, уводзіны (або прадмову), назвы глаў, а ў кожнай з іх – назвы раздзелаў, заканчэнне, бібліяграфію і, калі ёсць, дадатак [1, с. 48].

Кожная з глаў з'яўляецца састаўной часткай тэмы, а раздзелы – гэта частка главы, таму назвы ўсёй тэмы работы і яе раздзелаў не павінны супадаць. Фармулёўкі тэм, глаў і раздзелаў павінны адказваць пэўным патрабаванням. Да іх адносяцца: канкрэтнасць, адсутнасць двухсэнсоўнасці, сціслаcць выкладу.

Прыкладны аб'ём дыпломнай работы вызначаецца кафедрай, ён удакладняецца навуковым кіраўніком з самім студэнтам. Па гуманітарных дысцыплінах аб'ём дыпломнага сачынення звычайна складае 30–40 старонак, уключаючы дадатак. Калі ж дыпломнае заданне ўключае ў сябе выкананне лабараторнага аналізу або эксперыменту, рашэнне матэматычнай задачы, падрыхтоўку чарцяжоў, табліц і г. д., то тэкставая частка работы скарачаецца.

Уводзіны дыпломнай работы звычайна займаюць 3–4 старонкі. Уводзіны – гэта візітная картка дыпломнай работы. У іх даецца абгрунтаванне тэмы, яе актуальнасць, вызначаюцца мэты і задачы даследавання, метадалагічная аснова, прыводзіцца характарыстыка крыніц базы і агляд наяўнай літаратуры.

Асноўную структурную частку работы складаюць главы. Іх павінна быць не менш за дзве. Кожная глава павінна асвятляць самастойнае пытанне вывучаемай тэмы, а калі глава падзелена на раздзелы, то кожны раздзел – асобную частку гэтага пытання. Пры напісанні

глаў і раздзелаў трэба дамагацца захавання лагічнай сувязі паміж імі, паслядоўнага пераходу ад аднаго раздзела да другога ўнутры глаў, ад адной главы да другой. Змест глаў і раздзелаў павінен адпавядаць іх назвам, быць абгрунтаваным. Па аб'ёме яны павінны быць прыблізна роўнымі паміж сабой. Главы і раздзелы павінны заканчвацца вывадамі, хаця б кароткімі.

Завяршае дыпломную работу заключэнне (4–6 старонак). У ім робяць вывады па працы ў цэлым, падводзяць вынікі ўсяму даследаванню, намячаюць, калі патрэбна, перспектывы дальнейшага вывучэння праблемы, паказваюць яе сувязь з сучаснасцю, прапаноўваюць практычныя рэкамендацыі. Заканчэнне канстатуе ступень рэалізацыі мэт і задач, пастаўленых ва ўводзінах, навукова-тэарэтычную каштоўнасць выкананай работы. Завершаная дыпломная работа падпісваецца толькі аўтарам і навуковым кіраўніком, прадстаўляецца на кафедру не пазней чым за дзесяць дзён да прызначанага часу абароны [1, с. 49].

Адначасова з працай падаецца водгук навуковага кіраўніка, скарочаны аналіз дыпломнага даследавання і заключэнне аб допуску дыпломнай працы да абароны. У водгуку навуковы кіраўнік можа выказаць сваю думку аб працы. Кафедра накіроўвае тэкст дыпломнай работы разам з водгукам навуковага кіраўніка на знешняе рэцэнзаванне. Па традыцыі вышэйшай школы рэцэнзентамі могут быць выкладчыкі іншых кафедр, вучоныя навукова-даследчых устаноў, высокакваліфікаваныя спецыялісты адпаведных галін або сфер дзейнасці.

Рэцэнзент дае разгорнуты пісьмовы водгук (рэцэнзію) на працу, які адлюстроўвае: адзнаку актуальнасці абранай тэмы і ступень яе абгрунтавання; правільнасць пастаўленых мэт і задач даследавання, паўнату іх рэалізацыі; правільнасць плана; веды і выкарыстанне студэнтам літаратуры. У рэцэнзіі звычайна пазначаецца, наколькі пераканаўча асветлены пытанні плана дыпломнай работы, абгрунтаваны і аргументаваны зробленыя вывады і практычныя рэкамендацыі; якая ў іх навуковая навізна, тэарытычная і практычная каштоўнасць і магчымыя сферы выкарыстання. Звяртаецца ўвага на якасць афармлення работы. Напрыканцы рэцэнзіі даецца ацэнка дыпломнай работы.

Старшыня ДЭК аб'яўляе тэму працы, прозвішча, імя і імя па бацьку дыпломніка, і студэнт распачынае абарону. На працягу 10–15 хвілін ён павінен абгрунтаваць актуальнасць даследаванай тэмы, даць характарыстыку, коратка выкласці змест працы па главах, далажыць аб зробленых вывадах і ўнесеных практычных рэкамендацыях. Тэкст выступлення неабходна ўзгадніць з навуковым кіраўніком. Трэба падумаць таксама над пытаннямі, якія могуць узнікнуць падчас абароны. У сувязі з гэтым дыпломніку належыць паўторна папрацаваць над літаратурай, сабраць дадатковыя факты для параўнання, умець раскрыць прычынна-выніковыя сувязі і заканамернасці. Неабходна падрыхтаваць ілюстрацыйны матэрыял: дыяграмы, схемы, графікі і г. д., якія могуць спатрэбіцца падчас абароны.

Пасля заканчэння выступлення дыпломніка члены ДЭК, рэцэнзент і ўсе прысутныя могуць задаваць яму пытанні па сутнасці працы. Дыпломніку пажадана дакладна запісаць усе пытанні, пасля чаго можна адказваць на іх адразу або перад заключным словам. Адказы павінны быць дакладнымі, вычарпальнымі па сутнасці зададзеных пытанняў. Пасля дыпломніка выступае рэцэнзент, які коратка паведамляе сваю думку аб абараняемай працы і, калі лічыць патрэбным, робіць заўвагі аб выступленні аўтара і яго адказах.

Дыпломнік павінен адказаць на заўвагі рэцэнзента, пададзеныя ў пісьмовым водгуку або вусным выступленні, даць тлумачэнне па адзначаных недахопах адразу або ў заключным слове. Акрамя рэцэнзента, на абароне дыпломнай работы па сутнасці праведзенага даследавання можа выступіць любы з прысутных.

Напрыканцы абароны дыпломнік атрымоўвае заключнае слова, у якім можа яшчэ раз пацвердзіць або ўдакладніць сваю пазіцыю па ўзнятых пры абмеркаванні працы пытаннях, адказаць на пытанні і заўвагі выступоўцаў, выказаць падзяку навуковаму кіраўніку і г. д.

Адзнаку выносіць ДЭК большасцю галасоў на закрытым пасяджэнні. Пры вынясенні адзнакі ўлічваецца тэарэтычны ўзровень і практычная значнасць працы, шырыня яе

навуковай базы, веданне навуковай літаратуры, правільнасць пастаноўкі мэт і задач даследавання, самастойнасць і паўната рашэння, афармленне, а таксама ўменне студэнта выкласці на абароне сутнасць сваёй працы і правільнасць адказаў на зададзеныя пытанні, уменне адстойваць сваю пазіцыю, весці навуковую дыскусію.

**Заключэнне.** Такім чынам, дыпломная работа разглядаецца як адзін з відаў навуковай працы з характэрнымі рысамі, якія належаць навуковаму стылю мовы: лагічнасць і строгасць выкладу, абагульненасць і абстрагаванасць, дакладнасць, аб’ектыўнасць, аргументаванасць, інфармацыйная насычанасць. Дыпломная работа – гэта самастойная даследчая праца будучага спецыяліста, звязаная з яго дзейнасцю ў пэўнай галіне навукі і тэхнікі.

## Літаратура

1. Кузьміч В. А., Міксюк Р. В., Савіцкая Н. Я., Скорабагатая А. І., Швед Г. Ф. Навуковы стыль мовы. Водгук, рэцэнзія, анатацыя, рэферат, дыпломная работа. Мінск: БДТУ, 1999. С. 66.

## References

1. Kuzmich V. A., Miksyuk R. V., Savitskaya N. Y., Skorabagataya A. I., Shved G. F. *Navukovy styl’ movy. Vodguk, retsenziya, anatatsyya, referat, dyplomnaya rabota* [Scientific style of speech. Response, review, annotation, summary, diploma work]. Minsk, BGTU Publ., 1999, p. 66.

## Інфармацыя пра аўтара

**Швед Генадзь Філарэтавіч** – старшы выкладчык кафедры беларускай філалогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: shved@belstu.by

## Information about the author

**Shved Henadz Filaretavich** – Senior Lecturer, the Department of Belarusian Philology. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: shved@belstu.by

*Паступіў 11.04.2019*